

## Уладзімір ЯСЕЎ

### Повязь

*Мяне ўратуе вёска ад самоты,*
*Ад мітусення гарадскога дня —*
*Там, дзе на рэчцы ў зараснях чароту*
*Стракозы пералівіста звіняць.*

*І гэты звон, і водар сенажаці*
*Душу паволі вернуць да жыцця:*
*Я дакрануся да далоняў маці,*
*Пачую голас бацькі з забыцця.*

*Уваскрашу сумленнасці*
*сапраўднасць,*
*Гучанне слоў, пачуццяў*
*вастрыню,*
*Сусвету зразумею*
*паўнапраўнасць*
*І сувязь пакаленняў аднаўлю.*

### Вішнёвы сон

*Паляцяць пялёсткі майскіх вішняў,*
*Нібы белы некрануты снег,*
*Вецер памяць сумам ускалыша,*
*Нагадаўшы пра кароткі век.*

*Вёсачка — пакінутая прыстань...*
*Хоць даўно жыццё ідзе на лад,*
*Толькі кожнай ночкаю срабрыстай*
*Сню цяністы, беласнежны сад.*

*Жаўрукі паклічуць з зорных высяў*
*Нас жыцця старонкі дапісаць —*
*Прашапоча белых вішняў лісце:*
*«Зноўку будзем вёсны сустракаць!»*

*Вёска — вёсачка, далёкая і блізкая,*
*Мне прысніся — сэрца супакой*
*Чыстымі крыніцамі празрыстымі*
*І квітненнем вішняў над ракой.*

### Час гуку

*Гадзіннікі гучаць усё чутней.*
*Час растае, як лёд на гулкіх рэках,*
*Сціхае скрыгат лютаўскіх завей,*
*І толькі ветру падпявае рэха.*

*Уздых пупышак. Шум крыві. Усхліп*
*Майго дыхання. Лес дрыжыць маўкліва.*
*Я безнадзейна гукамі прыліп*
*Да дзён маіх звычайных, звышімклівых.*

*Усё чакаю з вокрыкам у снах*
*Твайго гукання і таго збавення...*
*Адмерана і ў словах, і ў грахах*
*Слухмянасць гукаў, роспач у памкненнях.*

*Няхай у гэтым і нуда, і мука —*
*Я аддаю сваё жыццё тым гукам.*

### Цішыня

*У цішыні таксама ёсць свой гук —*
*Яна звініць і закладае вушы.*
*Цурчыць нягучна звілісты раўчук,*
*А жыта ў полі храбусціць ад сушы.*

*У кнігах на паліцах думкі спяць,*
*Хаваючы затоенасці тэкстаў.*
*З нягучнасці радкоў ні ўцячы, ні ўзяць,*
*І ў цішыні блукаюць сэнсы зместу.*

*Выявы і пачуцці ўсё гучней.*
*Прызнанне чутна*
*ў стрыманым паглядзе...*
*Захочацца пад немы ўздых завей*
*Па-людску жыць,*
*па згодзе справы ладзіць.*

*І я на думцы зноў сябе лаўлю:*
*Без гукаў не пачуеш цішыню.*

### Існасць

*Што можа існасць:*
*знікнуць і прымусіць,*
*Негаварліва бліснуць і паспець*
*Застацца слушнай і праўдзіва схлусіць,*
*З гаючых думак збудаваць павець.*

*Там гадаваць нагоды, меркаванні,*
*Благія мары, факты і разлік...*
*Спрактыкавана рыхтаваць пытанні,*
*Каб адназначна іншы довад знік.*

*А мы шукаем існасці заўзята,*
*Не разумеем сэнс з усіх бакоў.*
*Для нас служэнне ведам — гэта свята,*
*Адзіны подых да канца вякоў.*

*У мностве меж жыве адна рэальнасць,*
*А ці ўспрымаем мы яе шматграннасць?*